Палітычная сфера
Інстытут палітычных
даследаванняў

Palitsfera Working Papers No. 5/2026

# АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І ЛАТВІІ: АГУЛЬНЫ АГЛЯД 1991 — 2026

Palitsfera Working Papers No. 5/2026

# Адносіны Беларусі і Латвіі: агульны агляд 1991 — 2026

Максім Каралёў

Інстытут палітычных даследаванняў
“Палітычная сфера

# Палітычныя стасункі

***Палітычнае супрацоўніцтва.*** Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай былі ўсталяваныя 7 красавіка 1992 года. На той момант абедзве дзяржавы з'яўляліся постсавецкімі парламенцкімі рэспублікамі. Аднак ужо ў першыя гады незалежнасці іх палітычнае развіццё пайшло рознымі шляхамі. Латвія вярнулася да Канстытуцыі 1922 года і працягнула ўмацоўваць парламенцкую дэмакратыю, тады як у Беларусі пасля ўвядзення ў 1994 годзе пасады прэзідэнта адбыўся паступовы пераход да аўтарытарнай мадэлі кіравання.

Латвія выразна акрэсліла свой курс і на сённяшні дзень з'яўляецца членам Еўрапейскага саюза, НАТА, Савета Еўропы, Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР/OECD). Беларусь арыентуецца на расійскія і еўразійскія структуры: Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), Еўразійскі эканамічны саюз, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва. Ключавыя пляцоўкі, дзе абедзве краіны з'яўляюцца паўнапраўнымі членамі, — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ).

Фармаванне двухбаковых кантактаў паміж Беларуссю і Латвіяй пачалося падчас іх знаходжання ў складзе СССР і працягнулася пасля яго распаду яшчэ да юрыдычнага ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Так, у снежні 1991 года старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч, кіраўнік краіны на той час, наведаў Рыгу для падпісання Дэкларацыі аб прынцыпах добрасуседскіх адносін. Для абедзвюх дзяржаў важнымі задачамі былі міжнароднае прызнанне, дэмаркацыя межаў і стварэнне механізмаў эканамічнага ўзаемадзеяння.

У першай палове 1990-х гадоў галоўнымі напрамкамі супрацоўніцтва былі ўрэгуляванне мяжы (Голубев, 2018: 281—287), транзіт, лагістыка і гандаль.
У 1993–1995 гадах быў падпісаны шэраг базавых пагадненняў, якія заклалі аснову двухбаковых адносін: аб пагранічных пытаннях, аб пунктах пропуску, аб дзяржаўнай мяжы, аб прававой дапамозе, аб міжнародных аўтамабільных зносінах і аб паветраных зносінах. У гэты ж перыяд адбываліся рэгулярныя кантакты на ўрадавым узроўні. У лютым 1994 года ў Мінск прыязджаў прэм'ер-міністр Латвіі Валдыс Біркаўс, а ў 1995 годзе Беларусь двойчы наведваў кіраўнік латвійскага ўрада Марыс Гайліс.

Для Беларусі супрацоўніцтва з Латвіяй мела асаблівае значэнне як з-за геаграфічнай блізкасці, так і праз доступ да латвійскай транспартнай інфраструктуры. Латвійскія парты (перш за ўсё Вентспілс і Рыга) разглядаліся Мінскам як напрамкі экспарту нафтапрадуктаў, калійных угнаенняў і іншых грузаў. У сваю чаргу Латвія была зацікаўленая ў захаванні ролі Беларусі як важнага партнёра паміж ЕС і постсавецкай прасторай.

Пасля канстытуцыйнага крызісу 1996 года і пагаршэння адносін Беларусі з Захадам палітычны дыялог паміж Мінскам і Рыгай стаў больш асцярожным, аднак цалкам не спыніўся. Латвія ў канцы 1990-х гадоў працягвала

падтрымліваць кантакты з беларускімі ўладамі нават на фоне міжнароднай ізаляцыі Мінска. У 1997 годзе ў Вільнюсе на палях міжнароднай канферэнцыі "Суіснаванне нацый і добрасуседства — гарантыя бяспекі і стабільнасці ў Еўропе", якую арганізавалі сумесна Літва і Польшча, адбылася адзіная на сённяшні дзень сустрэча двух прэзідэнтаў — Аляксандра Лукашэнкі і Гунтыса Улманіса. Акрамя праблемы дэмакратыі ўсё большыя рознагалоссі набывалі адносіны па лініі Расія — НАТА. Тым не менш бакі канстатавалі, што палітычныя разыходжанні не павінны перашкаджаць эканоміцы, транзіту беларускіх тавараў праз латвійскія парты і завяршэнню дэмаркацыі мяжы. У 1998–1999 гадах адбыліся ўзаемныя візіты парламенцкіх і ўрадавых дэлегацый, а таксама былі падпісаныя новыя пагадненні ў сферы інвестыцый, мытнага супрацоўніцтва і трансгранічнага ўзаемадзеяння.

Пачатак 2000-х гадоў стаў перыядам паступовага ахалоджвання адносін. Пасля далучэння Латвіі да НАТА і Еўрапейскага саюза (2004) яе палітыка ў адносінах да Беларусі ўсё больш сінхранізавалася з агульнаеўрапейскім падыходам. Яшчэ ў 2001 годзе істотны рэзананс выклікала заява міністра абароны Латвіі Гіртса Крыстоўскіса, які назваў Беларусь патэнцыйнай пагрозай нацыянальнай бяспецы, а таксама непрызнанне Рыгай легітымнасці абрання А. Лукашэнкі на другі тэрмін. Тым не менш, да стадыі поўнай замарозкі адносін не дайшло. Бакі працягвалі падтрымліваць супрацоўніцтва ў сферах транспарту, эканомікі і памежнага ўзаемадзеяння. У 1999–2004 гадах былі заключаныя пагадненні аб умовах транзіту беларускіх грузаў праз латвійскія парты, аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, у сферы адукацыі, культуры, аховы здароўя і барацьбы са злачыннасцю.

Новы этап збліжэння пачаўся пасля 2008 года на фоне запуску ініцыятывы ЕС "Усходняе партнёрства" і часовай нармалізацыі адносін паміж Мінскам і Брусэлем. Сімвалічным момантам стала сустрэча прэм'ер-міністраў Сяргея Сідорскага і Іварса Годманіса на памежным пункце "Урбаны/Сілэнэ" ў ліпені 2008 года, якая фактычна адкрыла перыяд новай адлігі. У 2008–2010 гадах адбыўся шэраг візітаў кіраўнікоў урадаў, міністраў замежных спраў і галіновых ведамстваў.

Асаблівае значэнне меў падпісаны ў 2010 годзе дагавор аб спрошчаным парадку ўзаемных паездак жыхароў памежных тэрыторый. Пагадненне аб малым памежным руху стала адным з найбольш паспяховых прыкладаў супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС. Яно дазваляла жыхарам памежных рэгіёнаў перасякаць мяжу без шэнгенскіх віз па спецыяльных дазволах. У зону дзеяння пагаднення траплялі дзясяткі тысяч жыхароў Віцебскай вобласці і латвійскай Латгаліі. Для многіх памежных тэрыторый малы памежны рух стаў важным фактарам падтрымання міжчалавечых кантактаў, дробнага гандлю і лакальнага турызму. Латвія стала адзінай краінай ЕС, з якой Беларусь рэалізавала падобнае пагадненне.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў снежні 2010 года і ўвядзення новых санкцый ЕС адносіны зноў пагоршыліся. Аднак пасля ўкраінскага крызісу і пачатку расійскай агрэсіі 2014 года Рыга пачала займаць больш прыхільную

пазіцыю адносна Мінска. Беларусь усё часцей разглядалася латвійскімі палітыкамі як фактар рэгіянальнай стабільнасці і важны транзітны партнёр.
У 2014–2020 гадах назіралася новая актывізацыя палітычных кантактаў. Рэгулярна праходзілі пасяджэнні міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, адбываліся сустрэчы міністраў замежных спраў, транспарту, абароны і кіраўнікоў парламенцкіх структур.

У 2016–2020 гадах кантакты паміж дзяржавамі былі даволі інтэнсіўнымі і, бадай, самымі прадуктыўнымі за ўвесь постсавецкі перыяд. У 2018 годзе Беларусь наведаў прэм'ер-міністр Латвіі Марыс Кучынскіс, а ў студзені 2020 года — Крыш'яніс Карыньш. У гэты час актыўна абмяркоўваліся пытанні развіцця транзіту беларускіх грузаў праз латвійскія парты, супрацоўніцтва ў межах кітайскай ініцыятывы "Пояс — шлях", а таксама падрыхтоўка да сумеснага правядзення чэмпіянату свету па хакеі 2021 года.

На вясну 2020 года планаваўся першы ў гісторыі афіцыйны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Латвію, аднак ён так і не адбыўся — спачатку з-за пандэміі COVID-19, а пазней праз палітычны крызіс у Беларусі. Падзеі жніўня 2020 года сталі пераломным момантам у беларуска-латвійскіх адносінах. Латвія не прызнала вынікі беларускіх прэзідэнцкіх выбараў, асудзіла рэпрэсіі, падтрымала санкцыйную палітыку ЕС і істотна скараціла палітычныя кантакты з Мінскам.

***Прававая аснова супрацоўніцтва.*** Да 2020 года паміж Беларуссю і Латвіяй была сфармаваная шырокая прававая база, якая налічвала больш за 80 міждзяржаўных, міжурадавых і міжведамасных пагадненняў. Яны ахоплівалі практычна ўсе асноўныя сферы: памежнае рэгуляванне, транспарт і лагістыку, транзіт, мытную сферу, адукацыю, навуку, культуру, ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне, абарону інвестыцый і ўзаемадзеянне рэгіёнаў. Асабліва важнае месца займалі пагадненні, звязаныя з транспартна-лагістычнай сферай. Для Беларусі прынцыповае значэнне мелі дамовы аб міжнародных аўтамабільных і чыгуначных перавозках, выкарыстанні латвійскіх партоў і транзіце беларускіх грузаў праз тэрыторыю Латвіі. У 1999 годзе было заключана пагадненне аб умовах транзіту праз латвійскую транспартную інфраструктуру. Гэтая дамова стала адной з ключавых для беларускага экспарту ў краіны Захаду.

Важную ролю адыгрывалі таксама дакументы ў сферы памежнага супрацоўніцтва. Акрамя дагавора аб дзяржаўнай мяжы 1994 года бакі ўрэгулявалі працу пунктаў пропуску, пагранічных упаўнаважаных і іншыя тэхнічныя правілы. У 2010 годзе было падпісанае пагадненне аб малым памежным руху, якое стала ўнікальным прыкладам адносна глыбокай інтэграцыі паміж Беларуссю і краінай ЕС.

Пасля 2020 года, а асабліва пасля пачатку поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну ў 2022 годзе, здзейсненага ў тым ліку з тэрыторыі Беларусі, адбыўся паступовы дэмантаж прававой базы беларуска-латвійскіх адносін. У 2022–2023 гадах Латвія прыпыніла або дэнансавала шэраг ключавых пагадненняў. У верасні 2022 года Саэйма прыпыніла дзеянне пагадненняў аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, аб малым памежным руху і аб трансгранічным супрацоўніцтве. У кастрычніку 2022 года Латвія выйшла з

пагаднення аб узаемнай абароне інвестыцый, а пазней — з пагаднення аб узаемных паездках грамадзян.

Акрамя таго, былі прыпыненыя або фактычна страцілі практычнае значэнне пагадненні ў сферы авіяцыі, ваеннага супрацоўніцтва, інфармацыйнага абмену і транспартнай лагістыкі. У выніку найбольш моцна пацярпелі тыя сферы, якія раней складалі аснову супольных інтарэсаў: транзіт, рэгіянальнае ўзаемадзеянне і міжчалавечыя кантакты.

Пры гэтым бакі не пайшлі на поўны разрыў. Працягваюць дзейнічаць базавыя пагадненні аб дзяржаўнай мяжы, прававой дапамозе, сацыяльным забеспячэнні і частка дакументаў па лагістыцы. Гэта сведчыць пра імкненне захаваць мінімальна неабходныя механізмы прававой каардынацыі нават ва ўмовах глыбокага палітычнага крызісу.

***Дыпламатычная прысутнасць.*** Да 2020 года Беларусь і Латвія падтрымлівалі значную дыпламатычную прысутнасць. У Мінску дзейнічала амбасада Латвіі, а з 1994 года латвійскае консульства ў Віцебску. Беларусь мела амбасаду ў Рызе і генеральнае консульства ў Даўгаўпілсе. Асобнае месца ў двухбаковых адносінах займаў беларускі санаторый “Беларусь” у Юрмале, які з’яўляўся адным з сімвалаў беларускай прысутнасці ў Латвіі[1]. 24 мая 2021 года, на наступны дзень пасля прымусовай пасадкі самалёта Ryanair у Мінску, падчас чэмпіянату свету па хакеі (які першапачаткова Латвія і Беларусь павінны былі праводзіць разам) мэр Рыгі Мартыньш Стакіс і міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс[2] публічна замянілі афіцыйны чырвона-зялёны сцяг Беларусі на нацыянальны бел-чырвона-белы. Латвійскі бок назваў гэта рэакцыяй на “дзяржаўны тэрарызм”. У адказ на гэта Беларусь загадала амбасадару Латвіі Эйнарсу Семанісу пакінуць краіну на працягу 24 гадзін, а ўсяму астатняму персаналу амбасады — цягам 48 гадзін. Сярод супрацоўнікаў дазволілі пакінуць толькі аднаго адміністрацыйна-тэхнічнага работніка для догляду будынка. Натуральна, латвійскі бок выклікаў часовую паверыную Беларусі Наталлю Садоўскую і абвясціў аб сіметрычнай высылцы ўсіх беларускіх дыпламатаў і супрацоўнікаў пасольства ў Рызе. З таго часу працягваюць працу толькі консульскія пляцоўкі ў Віцебску і Даўгаўпілсе.

Паколькі афіцыйныя дыпламатычныя зносіны паміж Рыгай і Мінскам аказаліся фактычна згорнутыя, Латвія ў верасні 2024 года прызначыла асобнага спецыяльнага пасла з мэтай падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасці, праваабаронцаў, незалежных СМІ і каардынацыі працы з Офісам Святланы Ціханоўскай і Аб’яднаным пераходным кабінетам.

1. Пасля пачатку поўнамаштабнай вайны ва Украіне вясной 2022 года Гарантыйны фонд і фінансавыя органы Латвіі заблакавалі банкаўскія рахункі санаторыя з-за таго, што яго канчатковым бенефіцыярам з’яўлялася Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое трапіла пад санкцыі ЕС. У выніку санаторый афіцыйна спыніў прыём гасцей і пацыентаў, а яго дзейнасць была закансерваваная. Каб абысці сектаральныя санкцыі ЕС і аднавіць працу фінансавых рахункаў, Савет міністраў Беларусі восенню 2022 года прыняў пастанову тэрмінова змяніць уладальніка. Комплекс быў перададзены са структуры Кіраўніцтва справамі ў маёмасць Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. Аднак латвійскія ўлады не прызналі гэты юрыдычны перанос дзейным і пакінулі санкцыйныя абмежаванні ў сіле.

2. Цяпер — прэзідэнт Латвійскай Рэспублікі.

Амбасадарам па асаблівых даручэннях у пытаннях дэмакратычных сіл Беларусі (*Ambassador-at-large for democratic forces in Belarus*) стала Гунта Пасторэ (Gunta Pastore).

***Вобраз краін у СМІ.*** Важным індыкатарам трансфармацыі беларуска-латвійскіх адносін стаў і медыйны дыскурс. Аналіз публікацый[3] дзяржаўнага агенцтва БелТА за 2020–2026 гады паказвае, што Латвія ўсё радзей згадвалася ў кантэксце двухбаковага супрацоўніцтва і ўсё часцей — у сувязі з пытаннямі санкцый, памежнага кантролю, мілітарызацыі рэгіёна, а таксама сацыяльна-эканамічнымі праблемамі ў краінах ЕС. Можна сцвярджаць, што ў беларускім дзяржаўным інфармацыйным полі Латвія з'яўляецца амаль выключна часткай больш шырокага вобразу варожага "калектыўнага Захаду". Адначасова ў беларускім прапагандысцкім дыскурсе прасоўваецца наратыў пра адкрытасць Беларусі да латвійскага грамадства, што праяўлялася, у прыватнасці, праз акцэнтаванне тэмы бязвізавага рэжыму для грамадзян і неграмадзян Латвіі нават ва ўмовах палітычнага крызісу.

Аналіз публікацый латвійскага грамадскага медыя LSM.lv за аналагічны перыяд сведчыць пра істотную трансфармацыю вобразу Беларусі ў латвійскай інфармацыйнай прасторы. Калі раней Беларусь успрымалася перадусім як суседняя дзяржава і эканамічны партнёр, то пасля падзей 2020 года і пачатку расійскага ўварвання ва Украіну асноўнымі тэмамі сталі палітычныя рэпрэсіі, нелегальная міграцыя і пытанні бяспекі, якія выцякаюць з вайсковага супрацоўніцтва Мінска з Масквой. У выніку Беларусь у латвійскім дзяржаўным медыядыскурсе ўсё больш інтэгравалася ў агульны кантэкст пагроз з боку Расіі.

Разам з тым LSM.lv даволі актыўна асвятляла дзейнасць беларускіх дэмакратычных сіл, Офіса Святланы Ціханоўскай, праваабарончых і культурных ініцыятыў беларускай дыяспары ў Латвіі. У публікацыях рэгулярна ўздымаліся тэмы палітычных зняволеных, падтрымкі грамадзянскай супольнасці і інтэграцыі беларускіх эмігрантаў. Такім чынам, у латвійскім медыйным дыскурсе выразна прасочваецца падзел паміж беларускім рэжымам, які разглядаецца як крыніца рэгіянальнай пагрозы і саюзнік Расіі, і беларускім грамадствам, якое ў значнай ступені прадстаўляецца як ахвяра рэпрэсій і патэнцыйны партнёр еўрапейскай дэмакратычнай супольнасці. Аднак трэба таксама прызнаць, што апошнім часам пытанні бяспекі паступова пераважаюць над наратывам салідарнасці (Васілевіч, 2025: 117—124).

Варта адзначыць таксама працу каманды VšĮ DigitalHub, якая публікуе штомесячную аналітыку NARINT (*narrative intelligence*), дзе параўноўвае, як асноўныя падзеі асвятляліся вядучымі СМІ Беларусі, Латвіі і шэрагу іншых краін (NARINT, 5.08.2026).

3. Для параўнання былі выбраныя БелТА і LSM.lv. Трэба падкрэсліць, што першае з'яўляецца беларускім дзяржаўным інфармацыйным агенцтвам і напрамую кіруецца дзейнай уладаю. LSM.lv таксама фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту і аб'ядноўвае кантэнт Латвійскага тэлебачання і Латвійскага радыё, аднак мае значна большую ступень рэдакцыйнай незалежнасці. Паводле дадзеных *RSF World Press Freedom Index 2026,* Латвія займае 17-е, а Беларусь — 165-е месца са 180 краін. Аналіз праведзены з дапамогаю інструментаў штучнага інтэлекту.

# Візавыя пытанні, перасячэнне мяжы і міграцыйны крызіс

***Візавы рэжым.*** Візавы рэжым паміж Беларуссю і Латвіяй быў уведзены ў 1993 годзе. У 1990-я і пачатку 2000-х гадоў паміж краінамі дзейнічалі двухбаковыя пагадненні, якія дазвалялі жыхарам памежжа, пенсіянерам, асобам, якія ехалі на пахаванне ці да сваякоў, атрымліваць бясплатныя або танныя нацыянальныя візы па спрошчанай схеме. Правілы змяніліся пасля 1 мая 2004 года, калі Латвія ўвайшла ў Еўрасаюз і скасавала ўсе ранейшыя двухбаковыя дамовы з Беларуссю. Нацыянальныя латвійскія візы сталі афармляцца па агульных еўрапейскіх стандартах, а пасля далучэння Латвіі да Шэнгенскай зоны (21 снежня 2007 года) краіна цалкам перайшла на іх выдачу па шэнгенскіх правілах. Нягледзячы на гэта, колькасць выдадзеных віз грамадзянам Беларусі заставалася адносна высокай і рэзка знізілася толькі пасля падзей 2020 года.

Значную ролю ў трансгранічных кантактах адыгрываў і малы памежны рух. Толькі за першыя 5 гадоў яго існавання (2012–2016) было выдадзена больш за 6,5 тыс. дазволаў латвійскім бокам і больш за 45 тыс. беларускім (Латвия — Беларусь, 2018: 279).

Інфармацыю па колькасці выдадзеных беларускіх віз грамадзянам і неграмадзянам Латвіі знайсці ў адкрытых крыніцах даволі складана. Ва ўмовах палітычнай канфрантацыі Мінск у красавіку 2022 года абвясціў пра ўвядзенне на адзін месяц бязвізавага рэжыму для грамадзян і неграмадзян Латвіі, а таксама грамадзян Літвы. Пазней тэрмін быў працягнуты. З ліпеня да гэтай "праграмы" далучылі грамадзян Польшчы, а з сярэдзіны 2024 года беларускія ўлады абвясцілі так званы пашыраны бязвіз, пад які патрапілі грамадзяне 38 краін Еўропы і які дзейнічае дагэтуль[4].

Міністэрства замежных спраў Латвіі і Служба дзяржаўнай бяспекі (VDD) успрынялі ініцыятыву беларускага рэжыму крытычна-негатыўна, заявіўшы аб магчымых правакацыях і вярбоўцы, а таксама адсутнасці тэрміновай консульскай падтрымкі. Нягледзячы на гэта і на факты рэальных затрыманняў і прысудаў грамадзянам Латвіі, паводле дадзеных Дзяржпагранкамітэта Беларусі, ад моманту ўвядзення бязвіза і па май 2026 года грамадзяне і неграмадзяне Латвіі перасеклі беларускую мяжу 422 665 разоў. Больш часта ў Беларусь ездзілі толькі грамадзяне Літвы (ДПК, 2026).

Жыхары Латвіі, асабліва з памежных рэгіёнаў, едуць у Беларусь пераважна па асабістых справах: наведванне сваякоў, набыццё больш танных тавараў і паліва, а таксама лячэнне і адпачынак у беларускіх санаторыях.

4. Грамадзяне Літвы, Латвіі і Польшчы цяпер могуць знаходзіцца ў Беларусі да 90 дзён на год, іншых краін ЕС — да 30 дзён.

Пік такіх паездак прыпаў на 2022 год (больш за 180 тыс.), а ў 2025 годзе яны скараціліся прыблізна да 18 тыс. У 2023 годзе Латвія закрыла пункт пропуску "Сілэнэ" (з беларускага боку "Урбаны"), які па самай блізкай адлегласці злучаў Даўгаўпілс і Браслаў (траса Мінск — Рыга), а таксама пачала скарачаць колькасць дазволеных аўтобусных маршрутаў. У чэрвені 2026 года аўтобусны рух паміж Латвіяй і Беларуссю па ініцыятыве латвійскага боку быў цалкам спынены.

***Міграцыйны крызіс.*** Беларуска-латвійская мяжа працягласцю каля 173 км доўгі час заставалася адной з найменш канфліктных межаў Беларусі з краінамі ЕС. Асноўнымі пунктамі пропуску былі "Урбаны/Сілэнэ" і "Грыгораўшчына/Патэрніэкі". Абмяркоўвалася магчымасць адкрыцця пераходу "Друя/Піедруя" праз раку Дзвіну/Даўгаву — ад запуску новага турыстычнага парома да будаўніцтва лёгкага пешаходнага або пантоннага моста.

Да 2020 года значную частку трафіку складалі грузавыя перавозкі, звязаныя з транзітам беларускіх тавараў праз латвійскія парты. Было наладжана некалькі аўтобусных маршрутаў: Мінск — Рыга, Віцебск — Рыга, Рыга — Гомель, Даўгаўпілс — Браслаў, Полацк — Даўгаўпілс. У пэўны час хадзіў цягнік № 87/88 Мінск — Рыга, да якога прычапляўся бесперасадачны вагон Віцебск — Рыга (рух спынены з-за пандэміі каранавіруса і больш не быў адноўлены). Кампаніі airBaltic і Belavia забяспечвалі авіязносіны паміж краінамі, якія былі спыненыя пасля прымусовай пасадкі самалёта Ryanair у Мінску.

Сітуацыя кардынальна змянілася ў жніўні 2021 года, калі на беларуска-латвійскай мяжы пачаўся міграцыйны крызіс. Латвія абвінаваціла беларускія ўлады ў арганізацыі патоку нелегальных мігрантаў з Блізкага Усходу да межаў ЕС.
11 жніўня 2021 года ў чатырох памежных адміністрацыйных тэрыторыях (Лудзенскім, Краслаўскім, Аўгшдаўгаўскім краях і Даўгаўпілсе) быў уведзены рэжым надзвычайнай сітуацыі (*ārkārtējā situācija*). Гэты рэжым бесперапынна працягваўся і пазней трансфармаваўся ва "ўзмоцнены рэжым аховы мяжы".

Даследаванне Міркі Форці (Mirko Forti, 2023) тлумачыць латвійскі падыход праз тэорыю "выключнага права". Замест выкарыстання стандартных працэдур прыёму бежанцаў Латвія цалкам перавяла пытанне ў сферу нацыянальнай абароны. Галоўным вынікам стала прыняцце ўрадавых пастаноў, якія афіцыйна дазволілі Дзяржаўнай памежнай ахове (*Valsts robežsardze*) ужываць сілу для вяртання людзей у Беларусь без прыёму іх хадайніцтваў аб прытулку. Афіцыйны наратыў Рыгі, які падтрымліваецца Нацыянальнымі ўзброенымі сіламі і Міністэрствам унутраных спраў, грунтуецца на тым, што кожны мігрант — гэта інструмент у руках Аляксандра Лукашэнкі, а значыць, удзельнік гібрыднай атакі.

Урад Латвіі прыняў рашэнне аб маштабным будаўніцтве 173-кіламетровай агароджы, а таксама іншых інжынерных аб'ектаў для ўмацавання мяжы. У сярэдзіне 2024 года асноўная частка плота вышынёй каля 4 метраў з калючым дротам была цалкам гатовая. Агульныя выдаткі склалі больш за 126 млн еўра (VNĪ, 18.03.2026). У верасні 2023 года ўрад Латвіі прыняў рашэнне цалкам закрыць пункт пропуску "Сілэнэ" з прычыны таго, што беларускія службы пачалі выкарыстоўваць тэрыторыю каля КПП для падвозу і прарыву груп мігрантаў.

Персанал “Сілэнэ” быў перакінуты на ахову “зялёнай мяжы”. З таго часу адзіным акном паміж краінамі застаўся КПП “Патэрніэкі/Грыгораўшчына”.

Для мінімізацыі рызык нелегальнага пранікнення пад выглядам турыстаў Латвія паслядоўна забараніла перасячэнне мяжы пешшу, на роварах і істотна абмежавала магчымасці транзіту на аўтамабілях з беларускай рэгістрацыяй.

Прынятыя меры ў пэўнай ступені садзейнічалі паспяховай абароне, што, аднак, не прывяло да поўнага завяршэння спробаў нелегальнага пераходу. Па выніках першага паўгоддзя 2026 года Латвія стала асноўным кірункам нелегальнай міграцыі з тэрыторыі Беларусі. Паводле дадзеных Дзяржаўнай памежнай аховы Латвіі, у 2022 годзе колькасць спроб нелегальна перайсці мяжу складала 5 286, у 2023 годзе — 13 863, у 2024-м — каля 5,1 тыс., у 2025-м — больш за 12 тыс. (BNN 4.03.2024).

Калі на пачатку крызісу практыкі латвійскіх службаў аховы не цалкам адпавядалі еўрапейскаму заканадаўству і крытыкаваліся з боку Агенцтва ААН па справах бежанцаў (UNHCR), то з цягам часу падыход Латвіі, а таксама Літвы і Польшчы, якія зазналі тую ж праблему, стаў нормай для самога ЕС. Латвійскія, літоўскія і польскія дыпламаты актыўна лабіравалі прызнанне “інструменталізацыі мігрантаў” на ўзроўні Брусэля. У выніку жорсткія практыкі былі легалізаваныя ў межах абноўленага Шэнгенскага кодэкса, ператварыўшы нацыянальную мадэль абароны ў агульнаеўрапейскі стандарт аховы знешніх межаў.

Міграцыйны крызіс канчаткова трансфармаваў беларуска-латвійскія адносіны. Калі ў 1990-я — 2010-я гады мяжа ўспрымалася перадусім як прастора транзіту і супрацоўніцтва, то пасля 2021 года яна ўсё больш ператваралася ў лінію геапалітычнага супрацьстаяння паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам.

## Эканамічнае супрацоўніцтва

Нягледзячы на падобныя сацыяльна-дэмаграфічныя тэндэнцыі, эканамічнае развіццё Беларусі і Латвіі было вельмі розным. Калі ў 1995 годзе агульны аб’ём ВУП Беларусі амаль у 2,5 раза перавышаў латвійскі, то ў 2023 годзе — ужо толькі ў 1,7 раза. За гэты перыяд эканоміка Беларусі вырасла на 515%, а Латвіі — на 753%. У разліку на душу насельніцтва ВУП Беларусі ў 1995–2023 гадах павялічыўся ў 5,7 раза і склаў 7 829 USD, тады як у Латвіі ён вырас амаль у 10 разоў і дасягнуў 22 503 USD.

Эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Латвіяй на працягу 1990-х – 2010-х гадоў заставаліся найбольш устойлівым элементам двухбаковага супрацоўніцтва. Нават у перыяды палітычнага ахалоджвання эканамічныя сувязі працягвалі развівацца дзякуючы геаграфічнай блізкасці, лагістычнай узаемадапаўняльнасці і ролі Латвіі як транзітнага калідора для беларускага экспарту ў краіны Еўрапейскага саюза. Эканамічнае супрацоўніцтва з Беларуссю доўгі час разглядалася латвійскімі палітычнымі і бізнес-элітамі не толькі з боку камерцыйнага інтарэсу, але і як інструмент падтрымання рэгіянальнай стабільнасці і ўключэння Мінска ў еўрапейскія эканамічныя працэсы. Адносіны

будавалася на прынцыпе прагматычнага супрацоўніцтва, калі эканамічныя інтарэсы транспартна-лагістычнага сектара і муніцыпалітэтаў пераважвалі палітычныя і каштоўнасныя супярэчнасці (Bukovskis, 2012: 93–114).

Аснову беларуска-латвійскіх эканамічных адносін складалі транспарт і экспартна-лагістычныя паслугі, якія фактычна сталі галоўным матэрыяльным падмуркам двухбаковага супрацоўніцтва. Геаграфічнае становішча Латвіі, наяўнасць балтыйскіх партоў, якія не замярзаюць, і развітой чыгуначнай сеткі зрабілі краіну адным з ключавых транзітных партнёраў Беларусі пасля распаду СССР. У 2000-я – 2010-я гады латвійскія парты Рыгі, Вентспілса і Ліепаі адыгрывалі для беларускай эканомікі ролю аднаго з асноўных каналаў выхаду на рынкі ЕС і сусветнага гандлю. Паводле латвійскіх ацэнак, перад 2020 годам каля траціны ўсіх грузаў латвійскай чыгункі паступала з Беларусі або праз беларускую тэрыторыю (Cooperation, 11.10.2019).

Найбольшае значэнне мелі транзіт беларускіх нафтапрадуктаў, калійных угнаенняў, вуглехімічнай прадукцыі, лесаматэрыялаў і кантэйнерныя перавозкі. Асабліва цесна беларускі экспарт быў звязаны з Вентспілскім портам, які спецыялізаваўся на нафце і нафтапрадуктах, а таксама з Рыгай як універсальным транспартным вузлом. Для Латвіі беларускі транзіт быў не толькі эканамічным, але і палітычным фактарам: лагістычны сектар складаў і складае значную долю латвійскага экспарту паслуг і забяспечвае дзясяткі тысяч працоўных месцаў (Investment, 28.01.2022). Такім чынам падтрымлівалася канкурэнтаздольнасць уласнай транспартнай сістэмы ў суперніцтве з літоўскай Клайпедай і расійскімі балтыйскімі партамі.

У пачатку 2000-х гадоў таваразварот паміж дзвюма краінамі паступова павялічваўся, аднак сапраўдны выбухны рост адбыўся ў 2010–2012 гадах. Гэты перыяд стаў пікавым этапам беларуска-латвійскіх эканамічных адносін. У 2012 годзе агульны таваразварот паміж краінамі дасягнуў гістарычнага рэкорду — каля 3,5 млрд USD, а Латвія часова ўвайшла ў пяцёрку найбуйнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі. Ключавым фактарам гэтага росту стала выкарыстанне так званай растваральна-разбаўляльнай схемы. Яе сутнасць заключалася ў тым, што Беларусь імпартавала расійскую нафту без выплаты экспартных пошлін, пасля чаго прадукты перапрацоўкі экспартаваліся ў краіны ЕС пад выглядам растваральнікаў, разбаўляльнікаў і змазачных матэрыялаў.

Значная частка гэтых патокаў ішла праз латвійскія парты і лагістычную інфраструктуру. Фактычна Латвія стала адным з галоўных транзітных цэнтраў для рэалізацыі беларускай схемы на еўрапейскім рынку. Аднак ужо ў другой палове 2012 года, пасля ціску з боку Расіі і закрыцця адпаведных мытных шчылін, схема губляе актуальнасць, а паказчыкі таваразвароту вярнуліся да больш натуральнага ўзроўню.

У 2013–2020 гадах беларуска-латвійскі гандаль стабілізаваўся ў межах 400–650 млн USD штогод. Для гэтага перыяду была характэрная адносная ўстойлівасць эканамічных сувязяў, а Беларусь мела станоўчае сальда ў гандлі з Латвіяй. Асноўнымі артыкуламі беларускага экспарту заставаліся калійныя ўгнаенні,

нафтапрадукты, прадукцыя дрэваапрацоўкі, металургіі і хімічнай прамысловасці. Латвійскі экспарт у Беларусь быў значна меншым і ўключаў машынабудаўнічую прадукцыю, фармацэўтыку, электратэхніку, тэкстыль і харчовыя тавары.

У 2010-я гады паміж бакамі актыўна абмяркоўвалася стварэнне новых транспартных калідораў і індустрыяльна-лагістычных пляцовак (Assessment, 2021). У латвійскіх экспертных колах Беларусь разглядалася як важнае звяно паміж ЕС, ЕАЭС і кітайскімі інфраструктурнымі ініцыятывамі.

У гэтым кантэксце развіваліся і сумесныя бізнес-праекты. У 2011 годзе ў Латвіі дзейнічала 756 сумесных прадпрыемстваў з беларускім капіталам, у Беларусі — 377 прадпрыемстваў з латвійскім (Дайджест, 14.02.2012). Найбольш прыкметнымі былі беларускія лагістычныя і транзітныя кампаніі ў Латвіі. Беларускія дзяржаўныя кампаніі і звязаныя з імі аператары ўдзельнічалі ў працы тэрміналаў, экспедыцыйных кампаній і чыгуначнай лагістыкі. У Рызе і Вентспілсе дзейнічалі структуры, арыентаваныя на перавалку беларускіх нафтапрадуктаў і калію. У латвійскіх партах працавалі кампаніі, звязаныя з беларускім экспартам, у тым ліку ў сферы нафтахіміі і калійных угнаенняў.

У ліку прыярытэтных кірункаў былі абслугоўванне беларускага транзіту лагістычнымі аператарамі ў Рызе і Вентспілсе, а таксама праектаванне новых індустрыяльных цэнтраў для прыёму гэтых грузаў. Латвійскія парты канкуравалі з літоўскай Клайпедай за права абслугоўваць беларускі экспарт. Пры гэтым беларускія ўлады свядома выкарыстоўвалі канкурэнцыю паміж балтыйскімі дзяржавамі для атрымання больш выгадных тарыфаў і ўмоў.

Асобную ролю адыгрывалі сумесныя праекты ў сферы чыгуначных перавозак. У 2010-я гады Беларусь і Латвія развівалі кантэйнерныя маршруты паміж Кітаем, Беларуссю і балтыйскімі партамі, спрабуючы інтэгравацца ў лагістыку кітайскай ініцыятывы "Пояс — шлях". У Вентспілсе і Рызе разглядаліся праекты стварэння "сухіх партоў" і лагістычных хабаў для працы з беларускімі і еўразійскімі грузамі.

Адначасова эканамічнае супрацоўніцтва стварала і ўзаемную залежнасць. Латвійскі бізнес, асабліва транспартна-лагістычны сектар, быў зацікаўлены ў захаванні прагматычных адносін з Мінскам. Разам з тым гэтая мадэль мела структурную ўразлівасць. Латвійская транспартная сістэма была моцна залежная ад транзіту з Расіі і Беларусі. Паводле ацэнак латвійскіх даследчыкаў, асноўнымі грузамі партоў Рыгі і Вентспілса заставаліся нафта, нафтапрадукты і іншыя сыравінныя тавары з постсавецкай прасторы. У выніку любыя палітычныя або санкцыйныя абмежаванні непасрэдна білі па латвійскім транспартным сектары. Гэта часткова тлумачыла больш асцярожную пазіцыю Рыгі ў адносінах да Беларусі ў параўнанні з Літвой, асабліва ў 2014–2020 гадах. Латвія імкнуліся сумяшчаць падтрымку агульнай палітыкі ЕС з захаваннем эканамічнага супрацоўніцтва ў сферах, якія мелі стратэгічнае значэнне для латвійскай эканомікі.

У 2018–2019 гадах на першым месцы ў таварным экспарце Беларусі ў Латвію знаходзіліся падоўжна распілаваныя лесаматэрыялы — дошкі (22,3% ад усяго), на другім па выручцы — антыдэтанатары, антыаксіданты, інгібітары, загушчальнікі

(15,4%, верагодна, працяг усё той жа “растваральна-разбаўляльнай схемы” экспарту нафтапрадуктаў і хімтавараў), на трэцім — нафтапрадукты (10,8%). Галоўнымі тварнымі пазіцыямі імпарту ў Беларусь з Латвіі былі лекі, расфасаваныя для рознічнага продажу (14,6%), адзенне, якое было ва ўжыванні (“сэканд-хэнд”, 8,3%) і вырабы са сталі — вугалкі (5,7%) (Чем Беларусь торгует, 23.05.2019).

Пасля 2020 года значная частка беларуска-латвійскіх эканамічных праектаў пачала згортвацца. Палітычны крызіс у Беларусі, санкцыі ЕС, а затым і расійскае ўварванне ва Украіну ў 2022 годзе прывялі да рэзкага дэмантажу ранейшай мадэлі супрацоўніцтва. Транзіт беларускіх нафтапрадуктаў, калію і большасці іншых тавараў праз латвійскія парты быў фактычна спынены. Шэраг сумесных лагістычных праектаў страціў эканамічны сэнс або быў закрыты.

У выніку ўжо ў 2022–2023 гадах аб’ёмы гандлю і транзіту абваліліся да гістарычнага мінімуму. Пераарыентацыя тавараў беларускіх дзяржаўных кампаній на расійскія парты Балтыйскага мора для Латвіі азначала не толькі страты даходаў, але і структурны крызіс усёй транзітнай мадэлі развіцця, якая на працягу дзесяцігоддзяў будавалася на грузах з Беларусі і Расіі. У латвійскім грамадскім дыскурсе пасля 2022 года ўсё часцей пачалі гаварыць пра неабходнасць дыверсіфікацыі эканомікі і зніжэння залежнасці ад усходняга транзіту.

Да сярэдзіны 2020-х гадоў доля Беларусі ў знешнім гандлі Латвіі стала мінімальнай — каля 0,3–0,5%. Паводле латвійскай статыстыкі, у 2025 годзе (у параўнанні з 2024 годам) экспарт з Латвіі ў Беларусь скараціўся на 7,1% і склаў 132,5 млн EUR, тады як імпарт з Беларусі зменшыўся на 56,1% — да 65,4 млн EUR. Найбольшае падзенне закранула пастаўкі прадукцыі жывёльнага і расліннага паходжання, алеяў, тэкстылю, пластмас і каўчуку (Official statistics, 19.02.2026). Такім чынам, да 2025 года беларуска-латвійскія эканамічныя адносіны фактычна страцілі сваю ранейшую сістэмную ролю і перайшлі ў стан абмежаваных і фрагментарных кантактаў, якія падтрымліваюцца пераважна ў сферах, не ахопленых санкцыямі.

## Супрацоўніцтва ў галіне культуры, адукацыі і навукі

***Культурнае супрацоўніцтва.*** Супрацоўніцтва Беларусі і Латвіі ў галіне культуры, адукацыі і навукі на працягу доўгага часу заставалася адным з найбольш устойлівых элементаў двухбаковых адносін. Нават у перыяды палітычнага ахалоджвання гуманітарныя кантакты працягвалі развівацца дзякуючы геаграфічнай блізкасці, рэгіянальнаму супрацоўніцтву і ўдзелу ў еўрапейскіх праграмах трансгранічнага ўзаемадзеяння.

Прававую аснову супрацоўніцтва склалі некалькі базавых пагадненняў. Найбольш значнымі былі: *пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры і мастацтва* ад 18 красавіка 2002 года, а таксама *пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і навукі* ад 13 мая 2004 года. Асобна ў 2006 і 2018 гадах былі падпісаныя пагадненні

паміж Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Беларусі і Міністэрствам адукацыі і навукі Латвіі аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

У 2000-я — 2010-я гады асабліва актыўна развіваліся рэгіянальныя кантакты[5], перадусім паміж Віцебскай вобласцю і Латгаліяй. Латвійскія творчыя калектывы і фальклорныя ансамблі рэгулярна ўдзельнічалі ў культурных мерапрыемствах паўночнай Беларусі. У прыватнасці, прадстаўнікі Латвіі бралі ўдзел у міжнародным фестывалі народнай музыкі і песні "Звіняць цымбалы і гармонік" (Паставы), у Вішнёвым фэсце (Глыбокае), а таксама іншых этнаграфічных і рэгіянальных святах.

Адным з найбольш вядомых міжнародных культурных форумаў з удзелам латвійскага боку заставаўся Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Латвійскія выканаўцы, музычныя калектывы, рамеснікі і дэлегацыі ўдзельнічалі ў ім практычна штогод. У асобныя гады Латвія арганізоўвала ў межах фестывалю ўласныя культурныя праграмы. Беларускія спевакі ў 2002–2014 гадах удзельнічалі ў конкурсе маладых выканаўцаў "Новая хваля" ў Юрмале.

Важную ролю ў развіцці культурных сувязяў адыгрывала генеральнае консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску[6]. Яно да 2020 года рэгулярна арганізоўвала Дні латвійскай культуры, прымеркаваныя да Дня незалежнасці Латвіі (18 лістапада). У межах гэтых мерапрыемстваў у Віцебску, Полацку і іншых гарадах Віцебскай вобласці праходзілі канцэрты, кінапаказы, мастацкія і музейныя выставы, літаратурныя сустрэчы і прэзентацыі. Асобная ўвага надавалася супрацоўніцтву паміж музеямі, бібліятэкамі і мастацкімі школамі.
Важнай пляцоўкай беларуска-латвійскіх гуманітарных кантактаў стаў "Беларускі кірмаш" у Даўгаўпілсе, які з 2011 года праводзіўся пры падтрымцы беларускіх арганізацый і мясцовых уладаў Латгаліі.

У 2010-я гады значнае развіццё атрымалі сумесныя гісторыка-культурныя і турыстычныя праекты ў межах праграм трансгранічнага супрацоўніцтва ЕС. Адным з найбольш вядомых стаў праект *BELLA DVINA (Belarus—Latvia)*, рэалізаваны ў 2012–2014 гадах у межах праграмы *Latvia—Lithuania—Belarus Cross-Border Cooperation Programme*. Праект быў прысвечаны развіццю турызму і культурнай спадчыны ў басейне Заходняй Дзвіны (Даўгавы). У ім удзельнічалі муніцыпалітэты, музеі і культурныя ўстановы Віцебскай вобласці і Латгаліі. У межах *BELLA DVINA* распрацоўваліся агульныя турыстычныя маршруты, арганізоўваліся этнаграфічныя фестывалі, выдаваліся інфармацыйныя матэрыялы пра гісторыка-культурную спадчыну рэгёна і праводзіліся даследаванні трансгранічнай ідэнтычнасці.

5. Больш падрабязна гл.: Хмельницкая, 2018: 339—361.

6. Больш падрабязна гл.: Королёв и Екабсонс, 2017.

Прыкметным навуковым праектам стала ініцыятыва “Латышы і беларусы: разам праз стагоддзі”, якая з 2012 года аб’яднала даследчыкаў з Віцебска[7], Мінска, Магілёва, Рыгі і Даўгаўпілса. На першым этапе падтрымку яму аказала консульства Латвіі ў Віцебску, якое дапамагло ўсталяваць кантакты з латвійскімі калегамі. Праект прысвечаны агульным аспектам гісторыі беларусаў і латышоў у XIX–XXI стст.

У яго межах арганізоўваліся навуковыя канферэнцыі і круглыя сталы, прэзентацыі адпаведных навуковых выданняў, наладжаны выпуск аднайменнага навуковага рэцэнзаванага штогодніка (у 2026 годзе рыхтуецца 15-ты выпуск), а таксама праведзена 14 экспедыцый па месцах былых латышскіх калоній у Беларусі.

Адметнай падзеяй стаў пераклад на беларускую мову кнігі “Гісторыя Латвіі” (Бутуліс і Зунда, 2017). Афіцыйная прэзентацыя выдання прайшла 19 ліпеня 2017 года ў будынку амбасады Латвіі ў Мінску. Асноўны пераклад з латышскай мовы выканаў беларускі перакладчык і гісторык Ягор Сурскі. Рэдагаваннем тэксту, а таксама перакладам уступнага слова і прадмовы займаўся вядомы беларускі літаратар і філолаг Лявон Баршчэўскі.

У сферы адукацыі найбольш актыўныя кантакты развіваліся паміж універсітэтамі памежных рэгіёнаў. Адносна цеснае супрацоўніцтва існавала паміж Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава і Даўгаўпілскім універсітэтам. Установы арганізоўвалі акадэмічныя абмены, сумесныя навуковыя канферэнцыі і даследаванні ў сферах гісторыі, экалогіі, педагогікі і рэгіяналістыкі.

Актыўна супрацоўнічалі таксама Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і Рыжскі тэхнічны ўніверсітэт, перш за ўсё ў галіне лагістыкі, інфармацыйных тэхналогій і інжынерных даследаванняў.

Беларускія студэнты і выкладчыкі ўдзельнічалі ў праграмах *Erasmus Mundus* і *Erasmus+*, якія рэалізоўваліся сумесна з Латвійскім універсітэтам, Рыжскім універсітэтам імя Страдыня і іншымі ВНУ.

Навуковае супрацоўніцтва асабліва актывізавалася ў 2010-я гады дзякуючы еўрапейскім праграмам трансгранічнага супрацоўніцтва. Беларускія і латвійскія даследчыкі рэалізоўвалі праекты ў сферах экалогіі басейна Заходняй Дзвіны/Даўгавы, маніторынгу водных рэсурсаў, транспартнай лагістыкі, энергаэфектыўнасці, развіцця трансгранічных тэрыторый. Асобнае месца займалі даследаванні транспартных калідораў Усход — Захад і інтэграцыі беларускіх лагістычных маршрутаў у інфраструктуру балтыйскіх партоў. Частка гэтых праектаў ажыццяўлялася пры падтрымцы праграм ЕС INTERREG і іншых еўрапейскіх фондаў.

7. Перадусім выкладчыкаў кафедры сацыяльна-гуманітарных навук Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Пасля 2020 года гуманітарнае супрацоўніцтва пачало паступова згортвацца. Частка латвійскіх устаноў і ўніверсітэтаў абмежавала супрацоўніцтва з беларускімі дзяржаўнымі структурамі. Пасля пачатку расійскага ўварвання ва Украіну ў 2022 годзе значная частка сумесных адукацыйных, культурных і навуковых праектаў была фактычна замарожаная. У выніку да сярэдзіны 2020-х гадоў афіцыйныя гуманітарныя кантакты паміж Беларуссю і Латвіяй істотна скараціліся, што стала часткай агульнай дэградацыі двухбаковых адносін.

***Спорт.*** Асобным кірункам беларуска-латвійскага супрацоўніцтва заставалася сфера спорту. Прававой асновай стала *Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы спорту,* падпісанае 7 лютага 2018 года ў Мінску. Дакумент прадугледжваў абмен спартыўнымі дэлегацыямі, супрацоўніцтва паміж федэрацыямі, падрыхтоўку трэнераў, развіццё дзіцяча-юнацкага спорту і арганізацыю сумесных спаборніцтваў.

Да 2020 года супрацоўніцтва найбольш актыўна развівалася ў хакеі, лёгкай атлетыцы, біятлоне, веславанні і дзіцяча-юнацкім спорце. Латвійскія і беларускія клубы і зборныя рэгулярна ўдзельнічалі ў міжнародных турнірах на тэрыторыі абедзвюх краін. Асабліва актыўнымі былі кантакты паміж памежнымі рэгіёнамі і муніцыпалітэтамі Латгаліі і Віцебскай вобласці.

Найбольш амбіцыйным супольным праектам у спартыўнай сферы стала спроба Беларусі і Латвіі правесці сумесны чэмпіянат свету па хакеі — 2021. Першапачаткова турнір павінен быў адбыцца ў Мінску і Рызе, што разглядалася як сімвалічны прыклад рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж дзяржавай — членам ЕС і краінай — членам Усходняга партнёрства. Для Мінска правядзенне чэмпіянату мела важнае іміджавае значэнне і павінна было пацвердзіць здольнасць краіны прымаць міжнародныя мерапрыемствы высокага ўзроўню. Аднак пасля жорсткага падаўлення Беларускай рэвалюцыі 2020 года і міжнароднай крытыкі дзеянняў беларускіх уладаў Міжнародная федэрацыя хакея (IIHF) у студзені 2021 года пазбавіла Мінск права на правядзенне турніру. У выніку чэмпіянат адбыўся толькі ў Рызе. Латвійскія ўлады і частка грамадства адкрыта выступалі супраць сумеснага правядзення турніру з Беларуссю пасля падзей 2020 года, што стала яшчэ адным сімвалам пагаршэння двухбаковых адносін.

Пасля 2020 года спартыўныя кантакты пачалі рэзка скарачацца, а пасля расійскага ўварвання ва Украіну ў 2022 годзе супрацоўніцтва фактычна было спыненае. Латвія заняла адну з найбольш жорсткіх пазіцый у ЕС адносна ўдзелу беларускіх і расійскіх спартсменаў у міжнародных спаборніцтвах. У 2024 годзе парламент Латвіі (Саэйма) прыняў папраўкі да закона аб спорце, якія забаранілі нацыянальным зборным Латвіі праводзіць матчы супраць каманд Беларусі і Расіі нават у нейтральным статусе.

***Экспертныя ініцыятывы.*** Пасля 2020 года акадэмічная і экспертная прастора паміж Беларуссю і Латвіяй трансфармавалася: старыя міждзяржаўныя сувязі

фактычна замарожаныя, а новыя цэнтры ведаў развіваюцца альбо ўнутры Латвіі (для вывучэння Беларусі), альбо ў межах беларускай незалежнай экспертнай супольнасці ў замежжы.

Дзейныя экспертныя цэнтры і пляцоўкі размеркаваныя па некалькіх асноўных напрамках. У Латвіі яны засяроджаныя на пытаннях рэгіянальнай бяспекі, гібрыдных пагроз і міграцыі:

*Латвійскі інстытут замежнай палітыкі* (Latvian Institute of International Affairs — LIIA) — вядучая экспертная ўстанова Латвіі ў сферы міжнародных адносін. Яе аналітыкі рэгулярна публікуюць даследаванні пра геапалітычную ролю Беларусі, трансгранічны крызіс і ўплыў расійска-беларускай інтэграцыі на бяспеку краін Балтыі. LIIA рэгулярна выпускае зборнікі артыкулаў і аналітычных запісак (напрыклад, штогадовы *The Riga Conference Papers*), дзе разглядаецца пытанне беларускай знешняй палітыкі. Як адзін з галоўных дарадцаў МЗС Латвіі, інстытут праводзіць эканамічныя даследаванні эфектыўнасці санкцый ЕС супраць Мінска.

*Цэнтр перадавога вопыту НАТА па стратэгічных камунікацыях* (NATO StratCom COE) — міжнародны цэнтр, размешчаны ў Рызе, з'яўляецца вядучым экспертным органам па аналізе інфармацыйных аперацый і гібрыдных пагроз. Беларускі кірунак стаў адным з прыярытэтных для цэнтра пасля падзей 2020 года, а таксама ў кантэксце міграцыйнага крызісу і саўдзелу Мінска ў расійскай агрэсіі супраць Украіны. Адным з фундаментальных даследаванняў цэнтра па беларускай тэматыцы стаў падрабязны аналіз падзей жніўня 2020 года (Belarus protests, 2020). У гэтай працы рыжскія эксперты НАТА дэталёва расклалі механіку таго, як афіцыйны Мінск спрабаваў кіраваць лічбавым асяроддзем.

З другой паловы 2021 года NATO StratCom уключыўся ў аналіз трансмежавага крызісу на мяжы Беларусі з Латвіяй, Літвой і Польшчай. У межах праекта "Выяўленне наратываў у Балтыі" (*Narrative Detection in the Baltics*) цэнтр распрацоўвае лінгвістычныя мадэлі, якія здольныя распазнаваць культурныя нюансы і маніпуляцыі ў лічбавай прасторы на латышскай, літоўскай і эстонскай мовах, у тым ліку фіксаваць, як беларускія і расійскія боты і IT-арміі працуюць з аўдыторыяй краін Балтыі (Narrative Detection 14.05.2024).

На міжнародным узроўні Латвія выступае адным з фінансавых і палітычных донараў базы дадзеных *Міжнародная платформа адказнасці для Беларусі* (International Accountability Platform for Belarus). Гэта экспертна-дакументацыйны праект, дзе міжнародныя і беларускія эксперты, уключаючы праваабарончы цэнтр "Вясна", збіраюць і аналізуюць доказы парушэння правоў чалавека рэжымам у Мінску пасля 2020 года.

Таксама кансорцыумам з пяці партнёраў з Латвіі (LIIA), Даніі (Дацкае таварыства знешняй палітыкі; Дацкі культурны інстытут у Эстоніі, Латвіі і Літве; Культурнае таварыства Beladania) і Літвы (Цэнтр беларускіх і рэгіянальных даследаванняў пры Еўрапейскім гуманітарным універсітэце) пры фінансавай падтрымцы Савета міністраў Паўночных краін была ўтвораная Беларуская даследчая сетка па палітыцы суседства (*Belarus Research Network on Neighborhood Policy*). Яе мэта — уключэнне беларускіх навукоўцаў у рэгіянальныя даследаванні і стварэнне

раўнапраўнага экспертнага дыялогу паміж даследчымі супольнасцямі Беларусі, краін Балтыі і Скандынавіі.

Да 2020 года ў Беларусі існавала развітая сетка як дзяржаўных акадэмічных структур, так і незалежных аналітычных цэнтраў , якія мэтанакіравана вывучалі Латвію, краіны Балтыі і рэгіянальнае супрацоўніцтва. У той час латвійскі кірунак лічыўся стратэгічным для Мінска, бо Латвія выступала важным транзітным хабам і лабістам змякчэння санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі.

На базе факультэта міжнародных адносін БДУ быў створаны *Цэнтр балтыйскіх даследаванняў БДУ* (Нацыянальны цэнтр міжнароднай праграмы The Baltic University Programme). Навукоўцы цэнтра сумесна з латвійскімі калегамі (у тым ліку з Латвійскага ўніверсітэта і Даўгаўпілскага ўніверсітэта) даследавалі басейн ракі Заходняя Дзвіна (Даўгава) і працавалі над праектамі ўстойлівага развіцця агульных прыродных рэсурсаў. Цэнтр каардынаваў навучанне беларускіх студэнтаў па спецыялізаваных рэгіянальных праграмах (кіраванне воднымі рэсурсамі, балтыйская рэгіяналістыка, устойлівы турызм). Лепшыя студэнты накіроўваліся на летнія акадэмічныя сустрэчы і стажыроўкі ў Швецыю, Латвію, Літву і Германію. На базе цэнтра рыхтаваліся экспертныя ацэнкі для еўрапейскіх грантавых праграм *"Латвія — Літва — Беларусь"*.

*Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў* (БІСД) і *Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь* (НДЭІ) рыхтавалі для беларускага ўрада аналітычныя матэрыялы па павелічэнні беларускага транзіту праз парты Рыгі і Вентспілса. Менавіта яны пралічвалі эканамічную мэтазгоднасць сумесных прадпрыемстваў і каардынавалі лагістычныя ланцужкі.

Латвійскі трэк займаў важнае месца ў дзейнасці "*Мінскага дыялогу*", асабліва ў перыяд яго росквіту як буйной міжнароднай экспертнай пляцоўкі ў 2015–2020 гадах. Для арганізатараў ініцыятывы Латвія бачылася як прыклад найбольш прагматычнай краіны Балтыі. Латвійскі бок у сваю чаргу ахвотна выкарыстоўваў пляцоўку для падтрымання эканамічных і геапалітычных сувязяў з Беларуссю ў абыход больш жорсткай пазіцыі Літвы. У маі 2017 года "Мінскі дыялог" сумесна з амбасадай Латвіі ў Беларусі арганізаваў спецыяльную экспертную дыскусію (Беларусь и Латвия, 3.05.2017). На ёй беларускія і латвійскія аналітыкі абмяркоўвалі рэгіянальны кантэкст і кітайскую ініцыятыву "16+1" (транспартныя калідоры з Кітая ў Еўропу). Менавіта тады эксперты супольна шукалі сінергію паміж інфраструктурай індустрыяльнага парку "Вялікі камень" і латвійскімі марскімі партамі.

Пасля жніўня 2020 года амаль уся экспертная інфраструктура ў Беларусі была знішчаная: сумесныя еўрапейскія праграмы трансмежавага супрацоўніцтва былі заблакаваныя, акадэмічныя абмены спыненыя, а незалежныя аналітычныя цэнтры былі вымушаныя альбо ліквідавацца, альбо эвакуіравацца ў краіны ЕС. Структуры, якія засталіся (напрыклад, БІСД), працуюць выключна ў вузкіх рамках дзяржаўнай замовы. Эксперты "Мінскага дыялогу" ў сваіх аналітычных прадуктах разглядаюць Латвію выключна ў кантэксце мілітарызацыі рэгіёна,

увядзення транспартных забарон і агульнага геапалітычнага тупіка ў адносінах Беларусі з краінамі ЕС.

Незалежныя беларускія эксперты на эміграцыі рэдка вывучаюць Латвію асобна, зазвычай уключаючы яе ў рэгіянальны кантэкст (сумесна з Літвой, Польшчай і краінамі Балтыі ў цэлым). Асноўнымі тэмамі тут выступаюць санкцыі і лагістыка, міграцыйны крызіс і прававы статус беларускіх рэлакантаў. Да такіх інстытуцый можна аднесці *Цэнтр беларускіх і рэгіянальных даследаванняў* (CBRS) пры ЕГУ, даследчы цэнтр *BEROC* і некаторыя іншыя. Пытанні дэзінфармацыі, прапаганды і маніпуляцыі разглядаюцца камандай VšĮ DigitalHub (FactCheck.LT).

## Нацыянальныя меншасці і міграцыя

***Латышы ў Беларусі.*** Нягледзячы на геаграфічную блізкасць і даўнія гістарычныя сувязі, на сённяшні дзень латышская дыяспара ў Беларусі вельмі сціплая, перапіс насельніцтва 2019 года аднатаваў крыху больш за 1,5 тыс. латышоў (Национальный состав, 2020: 4). Гэта ў асноўным нашчадкі латышскіх сялян-перасяленцаў часоў Расійскай імперыі, сярод якіх пераважаюць людзі сталага ўзросту, якія жывуць у Віцебскай вобласці і Мінску.

У 1995 годзе быў заснаваны Саюз латышоў Віцебскай вобласці “Даўгава”. Яго мэтамі было захаванне латышскай мовы і культурнай спадчыны, падтрымка кантактаў паміж латышамі Беларусі і Латвіі, арганізацыя культурных мерапрыемстваў, папулярызацыя латышскай культуры ў Беларусі. Яго кіраўнік уваходзіў у склад Кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь. Значнай дзейнасці арганізацыя не разгарнула, бо ў вялікай ступені залежала ад падтрымкі консульства Латвіі ў Віцебску. Рост унутраных супярэчнасцяў прывёў да фактычнага спынення ўсялякай актыўнасці на пачатку 2010-х гадоў. Нягледзячы на ўсе спробы рэанімаваць саюз з боку консульства і падтрымку мясцовых уладаў, арганізацыя пасля 2017 года перайшла ў стадыю ліквідацыі.

Яшчэ ў 1994 годзе пры консульстве Латвіі ў Віцебску была адкрытая Латышская нядзельная школа, дзе выкладалася мова, гісторыя і культура Латвіі, а таксама традыцыі латышскага народа. У 1997 годзе яе наведвала 35 дзяцей, у 2005 годзе — каля 20. У выніку адсутнасці вучняў у 2008 годзе школа спыніла існаванне.

Такім чынам, латышская супольнасць у Беларусі сёння знаходзіцца ў стане поўнага згасання. Большасць культурных арганізацый самаліквідаваліся яшчэ да 2020 года. Родная мова амаль страчаная, маладыя нашчадкі латышоў даўно асіміляваныя ці з’ехалі ў Латвію праз праграмы рэпатрыяцыі.

Латвійскай працоўнай альбо бізнес-эміграцыі ў Беларусі на сённяшні дзень практычна не існуе. МЗС Латвіі афіцыйна патрабуе ад сваіх грамадзян неадкладна пакінуць тэрыторыю Беларусі. Своеасаблівым феноменам сталі так званыя палітычныя ўцекачы з Латвіі — гэта нешматлікія прарасійскія актывісты ці блогеры, у тым ліку асобы, якія хаваюцца ад пераследу за апраўданне расійскай агрэсіі. Іх агульная колькасць па самым вялікім рахунку не перавышае некалькі

дзясяткаў чалавек. Беларускія дзяржаўныя органы і СМІ максімальна выкарыстоўваюць гэтых асоб з прапагандысцкімі мэтамі. Дзяржаўныя тэлеканалы здымаюць сюжэты, дзе рэлаканты выкрываюць галечу і прыціск рускамоўных у Латвіі і хваляць дабрабыт і свабоду ў Беларусі.

Яшчэ адной з’явай стала набыццё рэзідэнтамі Латвіі жылля ў гарадах Беларусі і пераезд сюды, пакуль свае кватэры ў Латвіі здаюцца ў арэнду. Можна меркаваць, што сярод такіх пераважаюць асобы, якія ўзялі расійскае грамадзянства і захавалі від на жыхарства ў Латвіі. Для паўнавартаснай ацэнкі гэтага працэсу пакуль не хапае верыфікаваных дадзеных. Ва ўсялякім выпадку можна сцвярджаць, што перспектыў для фарміравання значнай эмігранцкай супольнасці латышоў і нават рэзідэнтаў Латвіі ў Беларусі няма.

***Беларусы ў Латвіі.*** Унікальнасць беларускай прысутнасці ў Латвіі на сённяшні дзень палягае ў тым, што яна даволі выразна падзеленая на дзве прынцыповыя групы: гістарычную нацыянальную меншасць і палітычную эміграцыю пасля 2020 года. Гэтыя супольнасці маюць розны прававы статус, каштоўнасці, што вядзе зазвычай да немагчымасці каардынаваць сваю дзейнасць.

Беларускае насельніцтва традыцыйна жыло на латвійскіх землях, пераважна ў Латгаліі. У пасляваенны савецкі час назіралася пэўная хваля міграцыі, якую падтрымлівала палітычная лініі Масквы ў дачыненні да гэтай балтыйскай рэспублікі. Пасля 1991 года колькасць беларусаў трывала зніжалася, што было выклікана дэмаграфічнымі працэсамі старэння насельніцтва і асіміляцыі, у меншай ступені — вяртаннем на этнічную радзіму. Статыстыка гаворыць, што сёння ў Латвіі пражывае каля 53 тыс. беларусаў, больш за палову якіх мае латвійскае грамадзянства, а астатнія — статус неграмадзян Латвіі альбо пашпарты Расіі ці Беларусі. Трэба адзначыць, што значную частку латвійскіх беларусаў складаюць людзі савецкага светапогляду, якія слаба валодаюць беларускай мовай[8]. Толькі ўдзел у дзейнасці беларускіх таварыстваў дапамагае захоўваць пэўную нацыянальную самасвядомасць.

У Латвіі дзейнічае вялікая колькасць беларускіх арганізацый і творчых калектываў, пераважна дыяспаральнага тыпу. З 1988 года ў Рызе працуе Латвійскае таварыства беларускай культуры “Світанак”. Таварыства з самага пачатку стаяла на цвёрдых нацыянальных пазіцыях і даволі хутка дыстанцыявалася ад блізкіх кантактаў з афіцыйным Мінскам. У 1990 годзе ў Рызе ўзнікла беларускае таварыства “Прамень”, у 1993 годзе ў Даўгаўпілсе — культурна-асветніцкае таварыства “Уздым”. Далей гэты працэс працягваўся.
У 1994 годзе адбыўся першы з’езд беларусаў Балтыі.

8. Даследаванні вядомага польскага лінгвіста Мірaслава Янкавяка паказваюць, што беларускія гаворкі ў Латвіі захаваліся толькі ў некаторых “выспах” і сярод асоб сталага ўзросту. На гэтай падставе навуковец робіць выснову, што жывая беларуская мова ў Латвіі цалкам знікне цягам бліжэйшага дзесяцігоддзя (Jankowiak, 2025: 113; Янковяк, 9.10.2025).

У маі 2003 года беларускія таварыствы “Прамень”, “Уздым”, “Мара” (Ліепая) і “Спадчына” (Вентспілс) заснавалі злучанасць, якая з 2005 года атрымала назву “Саюз беларусаў Латвіі (СБЛ)”. З часам ён пашырыўся да 15 суполак. Старшынёй СБЛ была абраная Валянціна Піскунова, якая кіравала ім да жніўня 2020 года, калі перадала гэтую пасаду сваёй дачцэ Алене Лазаравай. Пад яе кіраўніцтвам СБЛ захаваў поўную лаяльнасць афіцыйнаму Мінску. У лютым 2021 года А. Лазарава нават прымала афіцыйны ўдзел у якасці дэлегата ад латвійскай дыяспары на VI Усебеларускім народным сходзе ў Мінску, дзе публічна падтрымала курс Аляксандра Лукашэнкі. Такая пазіцыя выклікала напружанасць у адносінах з латвійскім урадам і прывяла да фактычнай страты ранейшых сувязяў з латвійскімі дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі і культуры.

З 1991 года ў Латвіі дзейнічае аб’яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі “Маю гонар”, якое ўзначальвае кавалер ордэна Трох зорак Вячка Целеш. Таварыства рэгулярна арганізуе выставы мастакоў беларускага паходжання ў розных гарадах рэгіёна. У 1994 годзе намаганнямі таварыства “Світанак” і іншых беларускіх сіл быў адчынены першы клас Рыжскай беларускай пачатковай школы, першым дырэктарам якой стаў Вячка Целеш.

У жніўні 2024 года школа была ліквідаваная ў межах агульнадзяржаўнай рэформы па пераводзе навучання ва ўсіх школах нацыянальных меншасцяў на латышскую мову. Беларускі кампанент захаваўся пакуль у выглядзе факультатываў і праграм дадатковай пазашкольнай адукацыі. Трэба адзначыць тут таксама ўплыў дэмаграфічнай сітуацыі — апошнімі гадамі колькасць вучняў вагалася каля лічбы 150 чалавек, што не адпавядала мінімальным патрабаванням стандартаў Міністэрства адукацыі.

У 1999 годзе рашэннем дэпутатаў Даўгаўпілскай гарадской думы быў створаны Цэнтр беларускай культуры (ЦБК), мэтай якога было захаванне і развіццё беларускай нацыянальнай культуры і традыцый. ЦБК цалкам фінансаваўся з бюджэтных сродкаў. Пры ім былі створаныя шэсць творчых калектываў, сабраная бібліятэка і музейная этнаграфічная экспазіцыя, адкрытая нядзельная школа. Рэгулярна праводзіліся літаратурныя вечары і мастацкія выставы, адзначаліся народныя святы і памятныя даты. З 2011 года ЦБК разам з беларускім таварыствам “Уздым” арганізуе масавае свята “Беларускі кірмаш”, якое стала неад’емнай часткай культурнага календара Даўгаўпілса і з’яўляецца самым буйным мерапрыемствам беларусаў Латгаліі.

Ансамблі ЦБК станавіліся лаўрэатамі Латвійскага нацыянальнага свята песні і танца (адбываецца раз на 5 гадоў). З 2020 года ЦБК пачаў ладзіць навуковую канферэнцыю “Беларускія чытанні”, прымеркаваную да Дня роднай мовы. Кіравала цэнтрам Жанна Раманоўская. Нягледзячы на ўсе поспехі, у сувязі са зменай унутрыпалітычнай кан’юнктуры напрыканцы 2025 года ЦБК як самастойная ўстанова быў ліквідаваны і далучаны як сектар да Гарадскога дома культуры.

У цэлым да 2022 года латвійскія ўлады даволі актыўна падтрымлівалі беларускія культурныя таварыствы па лініі Міністэрства культуры. Пасля ўварвання Расіі ва Украіну адносіны Рыгі да “ўласных” беларусаў пагоршыліся і сталі характарызавацца напружанасцю і падазронасцю. Акрамя ўжо згаданага, была закрыта штомесячная праграма “Світанак” на Латвійскім радыё (LR-4), якая выходзіла з 1989 года і распавядала пра жыццё беларусаў Латвіі.

Беларускія ўлады па лініі МЗС і праз праграму “Беларусы ў свеце” да 2020 года таксама аказвалі падтрымку беларускім таварыствам (перадавалі кнігі, нацыянальныя строі) і спрыялі ўдзелу іх прадстаўнікоў у розных мерапрыемствах на тэрыторыі Беларусі. Значная дапамога (у тым ліку падручнікамі) аказвалася беларускай школе ў Рызе. Пасля 2020 года гэтая дзейнасць была моцна абмежаваная.

Эміграцыя ў Латвію пасля жніўня 2020 года не была масавай. Тым не менш Латвія ўвяла гуманітарныя механізмы падтрымкі беларусаў, уключаючы гуманітарныя візы, спрашчэнне працэдур атрымання дазволу на жыхарства, падтрымку рэлакацыі незалежных медыя і НДА, праграмы для студэнтаў і акадэмічнай супольнасці. Асобнай статыстыкі па гэтым трэку не існуе, але пры параўнанні дадзеных Упраўлення ў справах грамадзянства і міграцыі Латвіі (PMLP) за 2020 і 2025 гады бачна, што колькасць грамадзян Беларусі з дазволам на жыхарства вырасла з 1 289 да 4 370 (Pilsonības un migrācijas).

Новая эміграцыя карысталася першапачаткова высокім узроўнем палітычнага даверу з боку латвійскіх уладаў. Па ініцыятыве рэлакантаў было створана таварыства “Суполка” (Supolka), якое дапамагае з адаптацыяй, арганізуе палітычныя акцыі салідарнасці і культурна-асветніцкія мерапрыемствы ў Рызе і краіне ў цэлым.

Усталяванне цеснага кантакту новай эміграцыі са сталымі беларускімі арганізацыямі не адбылося. Супрацоўніцтва “Суполка” ўсталявала толькі з таварыствам “Світанак”. У практыцы назіраецца ўзаемнае адчужэнне і напружанасць. Гістарычная меншасць часта ставіцца да новых эмігрантаў як да “палітычных радыкалаў” і “разбуральнікаў стабільнасці”, а тыя лічаць мясцовых “пралукашэнкаўскімі” і “прарасійскімі”. Відавочны пэўны моўны бар’ер. Новая эміграцыя часцей выкарыстоўвае беларускую мову ў паўсядзённым жыцці і імкнецца вывучыць латышскую мову, тады як “старая” камунікуе амаль выключна па-руску. У выніку бакі часта ігнаруюць імпрэзы і ініцыятывы адзін аднаго.

Пасля 2022 года адносіны ўладаў да беларусаў, якія прыехалі, некалькі змяніліся, што тлумачылася перадусім пытаннямі бяспекі, перш за ўсё патэнцыйным шпіянажам на карысць беларускіх спецслужбаў. Былі ўведзеныя абмежаванні для беларусаў займаць пасады і працаваць у асобных сферах, якія прызнаюцца ўразлівымі ці крытычна важнымі, у тым ліку медыцыне. Да гэтага дадаліся абмежаванні ў набыцці маёмасці.

Падводзячы вынік адносна беларускай супольнасці ў Латвіі, можна канстатаваць глыбокі крызіс ідэнтычнасці. Сярод старэйшага пакалення моцныя савецкія

настальгічныя і прарасійскія сентыменты, руская мова з'яўляецца асноўнай. У той жа час менавіта гэтыя людзі складаюць аснову беларускіх таварыстваў і творчых калектываў, а адначасова іх аўдыторыю. Выключна гэтая актыўнасць дазваляе дагэтуль існаваць "выспам беларускасці".

Перавод адукацыі ў Латвіі цалкам на латышскую мову, закрыццё радыёвяшчання на мовах нацменшасцяў, скарачэнне падтрымкі нацыянальных таварыстваў, нават якія даказалі лаяльнасць латвійскай дзяржаве, істотна скарачае выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённасці. Разыходжанні і нежаданне супрацоўнічаць з новай хваляй беларускіх эмігрантаў знішчае падставы для абнаўлення і амаладжэння суполак. У такой сітуацыі перспектывы развіцця беларускай супольнасці выглядаюць няпэўнымі.

## Падсумаванне

Беларуска-латвійскія адносіны пасля 1991 года прайшлі шлях ад адносна шырокага і прагматычнага супрацоўніцтва да глыбокага палітычнага і эканамічнага адчужэння. Геаграфічная блізкасць, агульная мяжа, гістарычныя сувязі і ўзаемная эканамічная зацікаўленасць на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў стваралі ўмовы для інтэнсіўных кантактаў. Паміж дзвюма краінамі была сфармаваная шырокая дамоўна-прававая база, якая ахоплівала транспарт і транзіт, памежнае супрацоўніцтва, гандаль, культуру, адукацыю, навуку і рэгіянальныя праекты.

Асаблівую ролю ў гэтай мадэлі адыгрывалі эканамічныя інтарэсы. Для Беларусі Латвія была важным транзітным партнёрам і каналам доступу да балтыйскай партовай інфраструктуры, тады як беларускія грузы мелі істотнае значэнне для латвійскага транзітнага сектара. Паралельна развіваліся культурныя, адукацыйныя і навуковыя кантакты, у тым ліку на рэгіянальным узроўні. Усё гэта дазваляла падтрымліваць працоўны характар адносін, нягледзячы на істотныя палітычныя адрозненні.

Пераломным момантам стаў палітычны крызіс у Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Латвія не прызнала іх вынікі, асудзіла рэпрэсіі і далучылася да санкцыйнай палітыкі Еўрапейскага саюза. Пасля поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну ў 2022 годзе супрацьстаянне яшчэ больш узмацнілася. Санкцыі, спыненне транзіту беларускіх тавараў і пераарыентацыя грузапатокаў прывялі да дэмантажу ранейшай эканамічнай мадэлі.

Адначасова ўсё большую вагу ў адносінах набывалі пытанні бяспекі і памежнага кантролю. Міграцыйны крызіс, звязаны з арганізаваным перамяшчэннем мігрантаў праз тэрыторыю Беларусі,ператварыў беларуска-латвійскую мяжу з прасторы трансгранічнага супрацоўніцтва ў адну з ключавых праблем бяспекі Латвіі.

Такім чынам, сучасны стан беларуска-латвійскіх адносін нельга апісаць толькі як іх разрыў. Папярэдняя мадэль, заснаваная на эканамічнай узаемазалежнасці, транзіце і шырокім міждзяржаўным супрацоўніцтве, практычна спыніла

існаванне. На яе месцы фармуецца мадэль, у якой дамінуюць фактары геапалітыкі і бяспекі, а кантакты паміж насельніцтвам, культурнымі і навуковымі супольнасцямі набываюць перыферыйнае значэнне. Перспектывы беларуска-латвійскіх адносін будуць у значнай ступені залежаць ад палітычнай трансфармацыі Беларусі, сканчэння вайны ва Украіне і далейшага развіцця архітэктуры бяспекі Балтыйскага рэгіёна.

# Спасылкі


1. Agnieszka Kulesa (2025). From Belarus to the EU: Migration Trends and Strategic Responses, Policy Brief, Prague Process, June, https://www.pragueprocess.eu/en/resources/repository/34-briefs/525-from-belarus-to-the-eu-migration-trends-and-strategic-responses
2. Assessment of the Transit Corridor Belarus — Latvia — Sweden within Baltic Loop. Case Study of the Freeport of Ventspils, Ventspils 2021, https://www.balticloop.eu/wp-content/uploads/2021/06/Baltic-Loop-Assessment-of-Corridor-Belarus-Latvia-Sweden-by-VHTP.pdf
3. Belarus protests: Information Control and Technological Censorship (14.01.2021), https://stratcomcoe.org/publications/belarus-protests-information-control-and-technological-censorship/19
4. BNN (4.03.2024). Latvian State Border Guard reports illegal migrants have appeared again, https://bnn-news.com/latvian-state-border-guard-reports-illegal-migrants-have-appeared-again-254809
5. Bukovskis K. (2012). State Institutions, Interdependence and Perceptions in Latvia's Economic Relations with the Russian Federation and Belarus, [in:] Sprūds, A. (ed.). The Economic Presence of Russia and Belarus in the Baltic States: Risks and Opportunities, Riga: Latvian Institute of International Affairs, p. 93–114.
6. Cooperation with Belarus offers good prospects to the Latvian transit sector (11.10.2019). Port of Riga, https://rop.lv/en/news/cooperation-belarus-offers-good-prospects-latvian-transit-sector
7. Forti M. (2023). Belarus-sponsored Migration Movements and the Response by Lithuania, Latvia, and Poland: A Critical Appraisal, "European Papers", Vol. 8 (1), p. 227—238.
8. Investment and Development Agency of Latvia (28.01.2022), https://www.liaa.gov.lv/en/trade/industries/transit-and-logistics
9. Jankowiak M. (2025). Běloruská nářečí v Lotyšsku jako příklad lexikálního dědictví balto-slovanského pomezí = Gwary białoruskie na Łotwie jako przykład leksykalnego dziedzictwa pogranicza bałtycko-słowiańskiego. Praha.
10. NARINT за ліпень 2026: дзесяць падзей, у якіх інфармацыйныя рэальнасці разышліся (5.08.2026), https://factcheck.lt/bel/news/ndi_2026-07/
11. Narrative Detection and Topic Modelling in the Baltics (14.05.2024), https://stratcomcoe.org/publications/narrative-detection-and-topic-modelling-in-the-baltics/303
12. Nina Linde (2021). Latvia external relations briefing: Diaspora as Latvian foreign policy priority, "Weekly Briefing. China-CEE Institute", vol. 38, No 4 (LVA)
13. Official statistics of Latvia (19.02.2026). Value of exported goods rose by 3.7 % in 2025, https://stat.gov.lv/en/statistics-themes/trade-and-services/foreign-trade-goods/press-releases/26797-foreign-trade-latvia?themeCode=AT

14. Pilsonības un migrācijas lietu pārvalde (2020), https://www.pmlp.gov.lv/lv/statistika-uzturesanas-atlaujas-2020-gads
15. Pilsonības un migrācijas lietu pārvalde (2025, https://www.pmlp.gov.lv/lv/statistika-uzturesanas-atlaujas-2025-gads
16. VNĪ: noslēgusies Latvijas–Baltkrievijas robežas infrastruktūras izbūve; ekspluatācijā pieņemti rokādes ceļi ap Riču ezeru (18.03.2026), https://www.vni.lv/aktualitates/-vni-noslegusies-latvijasbaltkrievijas-robezas-infrastrukturas-izbuve-ekspluatacija-pienemti-rokades-celi-ap-ricu-ezeru
17. Беларусь и Латвия соседствуют без понимания регионального контекста друг друга (3.05.2017), UDF.by, https://udf.name/news/politic/156166-belarus-i-latviya-sosedstvuyut-bez-ponimaniya-regionalnogo-konteksta-drug-druga.html
18. Бутуліс, Ілгварс і Зунда, Антоній (2017). Гісторыя Латвіі. Пераклад з латышскай Ягора Сурскага. Мінск: Выдавец Зміцер Колас.
19. Васілевіч Г. (2025). Трансфармацыя стаўлення Латвіі да грамадзян Беларусі ў 2020–2025 гг.: ад палітычнага крызісу да геапалітычнай перабудовы, “Латыши и белорусы: вместе сквозь века”, вып. 14, с. 117—124.
20. Голубев В. (2018). Формирование белорусско-латвийской границы, [в:] Латвія — Беларусь: 1918—2018, М. Королёв (гл. ред.), Минск, с. 281—287.
21. Дайджест: Объём транзита между Беларусью и Латвией превысил 33,8 млн тонн (14.02.2012), Diplomatic Economic Club, https://dec.lv/NewsLv.php/NY14.htm?id=1451
22. Королёв М., Екабсонс Э. (2017). Консульство и консулы Латвии в Витебске, Витебск.
23. Национальный состав населения Республики Беларусь: статистический бюллетень, Минск 2020.
24. Хмельницкая Л. (2018). Беларусь — Латвия: диалог культур, [в:] Латвія — Беларусь: 1918—2018, М. Королёв (гл. ред.), Минск, с. 339—361.
25. Чем Беларусь торгует с Латвией и насколько (23.05.2019), banki24.by, https://banki24.by/news/3313-chem-belarus-torguet-s
26. Янковяк, Мірослаў (9.10.2025): У Латгаліі амаль не засталося носьбітаў беларускіх гаворак, Polskie Radio, URL https://www.polskieradio.pl/396/7811/Artykul/3587853

Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”
АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І ЛАТВІІ: АГУЛЬНЫ АГЛЯД 1991–2026
Максім Каралёў

www.palityka.org

Палітычная сфера
Інстытут палітычных
даследаванняў